# «СВЯТЫЯ ЗАКЛІКІ КУПАЛЫ» (ДА 80-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ)

**_Т. М. Дасаева_**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*dasaevatatsiana51@gmail.com*

Аналізуюцца мастацка-публіцыстычныя творы Янкі Купалы 1941–1942 гадоў, асэнсоўваецца іх уздзеянне на абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**_Ключавыя словы:_** народная вайна; беларускі народ; падпольны друк; публіцыстыка; вершы; партызаны; чырвонаармейцы; вораг; фашызм; няволя; помста; вызваленчая барацьба; адзінства; перамога.

# «HOLY CALLS OF KUPALA» (TO MARK THE 80TH ANNIVERSARY OF THE LIBERATION OF BELARUS FROM NAZI INVADERS)

**_T. M. Dasaeva_**

*Belarusian State University,*
*9, Kalvaryjskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: T. N. Dasaeva (dasaevatatsiana51@gmail.com)*

The article analyzes the artistic and journalistic works of Yanka Kupala from 1941–1942, comprehends their impact on the defenders of the Motherland during the Great Patriotic War.

**_Key words:_** the People's War; The Belarusian people; underground press; journalism; poems; partisans; Red Army men; enemy; fascism; captivity; revenge; liberation struggle; unity; victory.

Беларускі народ захоўвае памяць пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, ушаноўвае іх подзвіг. Словы ўдзячнасці і павагі заслугоўвае і дзейнасць беларускіх пісьменнікаў у гады ваеннага ліхалецця. Іх мастацка-публіцыстычныя творы гэтага перыяду ўвайшлі ў залаты фонд савецкай літаратуры, сталі класікай. Пісьменнікі заклікалі абаронцаў Айчыны да вызваленчай барацьбы, умацоўвалі сілу духу і веру ў перамогу над ворагам. Іх творы друкаваліся ў цэнтральных газетах «Правда», «Известия», «Комсомольская правда», «Красная звезда» і беларускіх выданнях «Савецкая Беларусь», «За Савецкую Беларусь», «За свабодную Беларусь», «Раздавім фашысцкую гадзіну», «Партызанская дубінка», «Блокнот партизана-агитатора», часопісе «Беларусь», а пасля засылаліся на фронт і ў тыл ворага.

У пералічаных выданнях публікаваліся і творы народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Яны адыгралі выключную ролю ў вызваленчай барацьбе беларускага народа.

Вайна застала Купалу ў Каўнасе. У той самы дзень, цягніком, што ўсю дарогу бамбілі нямецкія самалёты, ён выехаў у Мінск і прыбыў туды раніцай 23 чэрвеня 1941 г. Заехаўшы ў свой дом і захапіўшы самае неабходнае, Купала разам з жонкай Уладзіславай Францаўнай адразу ж выехаў на машыне на дачу ў Ляўкі, спадзеючыся, што немцы туды яшчэ не дайшлі. 24 чэрвеня ў дом Купалы ў Мінску трапіла бомба: згарэў архіў, бібліятэка, уся маёмасць. У Ляўках Купала з жонкай знаходзіліся некалькі дзён, а 30 чэрвеня выехалі ў Маскву. На пачатку ліпеня пад артылерыйскім агнём фашыстаў згарэла і дача Купалы ў Ляўках.

Убачанае і перажытае ў першыя дні вайны (бамбёжка, пажары, разбурэнні, гібель людзей) рэзка пагоршыла фізічны стан Купалы, але не спыніла, а, наадварот, актывізавала яго грамадскую і творчую дзейнасць. Слова Янкі Купалы заўсёды было сугучнае часу. Ён разумеў, што цяпер, калі такая трагедыя абрушылася на Радзіму, яго слова чакае народ, які ўзняўся на барацьбу з ворагам.

За невялікі адрэзак часу (чэрвень 1941 – чэрвень 1942), адмераны Янку Купалу лёсам, ён напісаў палымяныя публіцыстычныя артыкулы «Узнялася Беларусь», «Не будзе Беларусь рабом нямецкіх баронаў», «Фашызм – злейшы вораг беларускага народа», «Аб народнай вайне», «Радзіма кліча да помсты», «Народ-мсціўца», «Партызанскі ўдар» і вершы «Беларускім партызанам», «Грабежнік», «Паўстаў народ»,

«На Гітлера-звера», «Хлопчык і лётчык на вайне», «Зноў будзем шчасце мець і волю».

Уражвае і грамадская дзейнасць Янкі Купалы. 7 ліпеня 1941 г. ён прыехаў у Маскву. Разам з Якубам Коласам напісалі адозву да беларускага народа. 10–11 жніўня 1941 г. Купала ўдзельнічаў у Першым Усеславянскім мітынгу ў Маскве. Быў абраны членам прэзідыуму Усеславянскага антыфашысцкага камітэта. 11 жніўня выступіў на антыфашысцкім мітынгу з прамовай «Выше знамя борьбы за свободу и независимость». Разам з іншымі ўдзельнікамі мітынгу напісаў адозву да братоў-славян «Братья угнетенные славяне» з заклікам да яднання і вызваленчай барацьбы.

У канцы жніўня 1941 г. Купала прыехаў у Чарнарэцкае лясніцтва (Маскоўска-Казанскай чыгункі). 18 верасня наведаў рэдакцыю газеты «Коломенский рабочий», дзе адбылася сяброўская гутарка з супрацоўнікамі рэдакцыі, а 22 верасня сустрэўся з рабочымі Каломенскага машынабудаўнічага завода, чытаў ім вершы. У сярэдзіне кастрычніка пакінуў Казань. Па дарозе заехаў у Чэбаксары да чувашскага паэта Сямёна Эльгара, з якім пасябраваў у Арменіі. Знаходзіўся ў яго з 27 кастрычніка па 11 лістапада. З 13 лістапада 1941 г. да сярэдзіны чэрвеня 1942 г. Луцэвічы жылі ў пасёлку Пячышчы (недалёка ад Казані).

У лістападзе, першай палове снежня 1941 г. Купала з Пячышчаў на некаторы час пераехаў у Казань, пасяліўся ў гасцініцы «Татарстан». Знаходзячыся ў Казані, 25 лістапада 1941 г. выступіў на мітынгу беларускай інтэлігенцыі; 18 студзеня 1942 г. – на радыёмітынгу прадстаўнікоў беларускага народа з прамовай «Узнімайся, народзе мой, на вялікую расплату»; 12 сакавіка 1942 г. прыняў удзел у навуковай сесіі АН БССР (як акадэмік гэтай навуковай установы), дзе выступіў з дакладам «Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя».

Набліжаўся 60-гадовы юбілей Янкі Купалы. 18 чэрвеня 1942 г. ён прыехаў у Маскву, а 28 чэрвеня памёр.

Яшчэ ішла вайна. І тыя, хто змагаўся за вызваленне нашай краіны ад захопнікаў, пра смерць Янкі Купалы даведаліся не адразу, але «слова Паэта клікала іх усе гады чорнай акупацыі на бой з вылюдкамі» [1, с. 450]. Купала быў у адным страі з тымі, каму адрасаваў свае палымяныя адозвы, артыкулы, прамовы, вершы.

Асаблівай увагі заслугоўвае славуты верш Янкі Купалы «Беларускім партызанам», датаваны 19 верасня 1941 г. Паэт напісаў яго, калі

знаходзіўся ў Чарнарэцкім лясніцтве ў сям'і землякоў Міколы і Марыі Шыманскіх. Упершыню верш на рускай мове быў апублікаваны ў газеце «Красная звезда» (1941, 28 верасня). Пад назвай «Беларускія сыны» – у газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» (М., 1942). Друкаваўся і ў іншых перыядычных выданнях. У 1942 г. верш быў надрукаваны ў выглядзе лістоўкі з надпісам перад тэкстам: «Чырвоным партызанам ад працоўных Татарстана». Па ўсёй Беларусі прагучалі словы гэтага верша:

«Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны.

На руінах, папялішчах,
На крывавых іх слядах
Хай груган іх косці ліча,
На бяседу соваў кліча
Баль спраўляць на іх касцях.

Няхай Гітлеру-вампіру
Клююць сэрца, смокчуць кроў;
Сыты быў людскім ён жырам,
П'яны быў крывавым вірам, –
Хай жа гіне звер звяроў!» [2, с. 110].

<…>

Сілу ўздзеяння Купалаўскага верша засведчылі ўдзельнікі партызанскага руху на Беларусі ў сваіх успамінах, нарысах, вершах. Адзін з іх – мой бацька, Жук Мікалай Андрэевіч: партызан, настаўнік, паэт, аўтар двух паэтычных зборнікаў «Ля падножжа маіх святынь» (Горкі, 1995), «Запаветнае» (Любань, 2014). У гады Вялікай Айчыннай вайны ён змагаўся супраць ворага ў партызанскім атрадзе імя Катоўскага ў складзе брыгады імя Чкалава, што дзейнічала на Любаншчыне ў раёне вострава Зыслаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, васьмю медалямі, занесены ў кнігу «Памяць. Слуцкі раён, Слуцк» [3].

Літаратурнай творчасцю Мікола Жук пачаў займацца ў другой палове 1930-х гадоў, калі вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце імя Горкага. Яго вершы друкаваліся ў часопісе «Полымя рэвалюцыі». Чатыры гады юнак знаходзіўся ў літаратурным асяроддзі, сустракаўся з вядомымі беларускімі пісьменнікамі. Пашчасціла яму пабачыць і Янку Купалу, пачуць яго выступленні. Вайна не спыніла творчы працэс. Кароткімі ваеннымі начамі пасля цяжкіх баёў і стамляючых паходаў, апынуўшыся ў нейкім зацішным куточку, Мікола Жук запісваў на абрыўках газет, у самаробным блакноце тое, што перапаўняла яго сэрца. У партызанскай зоне нарадзіўся цэлы цыкл вершаў, сярод якіх і верш «Памяці Купалы»:

«Дазнаўся з болем я аб тым
З ліста парванае газеты,
Што не пабачыўся больш з ім, –
І чалавекам, і паэтам.

Ляжала перад намі гаць,
Схаваная сырым туманам.
Таварыш мне пачаў чытаць
Верш «Беларускім партызанам».

Газету я аддаў яму,
А сам прылёг ля мінамёта.
Глядзеў таварыш у імглу
І выціраў слязіну ўпотай.

Калі ж мы падняліся ў бой
Па ўсім балоце чорным, талым,
Мы ярасна няслі з сабой
Святыя заклікі Купалы.
Партызанская зона. 1943 г., Азярное.» [4, с. 28].

Дзейснае слова Купалы вяршыла вялікую справу. Верш «Беларускім партызанам» пабуджаў народных мсціўцаў да дзеяння – барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі за свабоду і незалежнасць Радзімы,

заклікаў да бязлітаснай помсты ворагу за ўчыненыя злачынствы («Кроў за кроў, а смерць за смерць!» [2, с.111]).

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Лойка А.* Як агонь, як вада… : Раман-эсэ пра Янку Купалу. Мінск: Маст. Літ., 1984. 486 с.
2. *Купала Янка*. Зб. тв.: У 6 т. Мінск, 1961–1963. Т 6. Вершы і паэмы: (1933–1942); Публіцыстыка; Лісты. Мінск: Выд-ва АН БССР, 1963. 689 с.
3. Памяць. Слуцкі раён, Слуцк. : У 2-х кн. Кн. 2-я. Мінск, БЕЛТА, 2001. 859 с.
4. *Жук М.* Ля падножжа маіх святынь : Вершы. Горкі, 1995. 134 с.